Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

# АРХІТЭКТОНІКА І ДЭКАРАТЫЎНАЯ ПЛАСТЫКА

*Вучэбная праграма*

*для вышэйшых навучальных устаноў*

*па спецыяльнасці 1- 15 02 01 “дэкаратыўна-прыкладное мастацтва”*

*па напрамку1-15 02 01-07*

*(“рэстаўрацыя твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва”)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2012

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Васюк Т. І. – дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Шаура Р.Ф. - доктар мастацтвазнаўства, прафесар, загадчык кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў .

Пракапцоў У. І. –дырэктар Дзяржаўнага мастацкага музея, кандыдат мастацтвазнаўства.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 11 ад 28.06.2012 );

Навукова метадычным саветам УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № ад )

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Уступ

Дысцыпліна «Архітэктоніка і дэкаратыўная пластыка» з'яўляецца часткай прафесийнай падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці «дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» («Рэстаўрацыя твораў Д.П.М.»). Яе выкладанне звязана з прадметамі «Кампазіцыя» і «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва». Матэрыялы курса разлічаны на засваенне ведаў па выкананні вучэбна-творчых заданняў у матэрыялах: гліна, салома, тэкстыль, дрэва, метал, і іншых эксперыментальна-творчых, новых тэхніках і тэхналогіях.

Змест курса накіраваны на засваенне і замацаванне ведаў па кампазіцыі, дызайну і аб'емна пластычным рашэнні вобразнай формы.

Курс вывучае кампазіцыйныя прыёмы, тэхнічныя метады, тэхналагічныя і канструктыўныя рашэнні.

Курс «Архітэктоніка і дэкаратыўная пластыка» прадугледжвае:

- эскізнае выкананне вучэбнай працы;
- засваенне тэхнік мастацкага рашэння дэкаратыўнай формы;
- вывучэнне вытокаў прыгожай формы;
- выкананне вучэбных заданняў у аб'ёме і матэрыяле.

*Мэтай* курса з'яўляецца развіццё у студэнтаў мастацкіх творчых здольнасцяў і фарміраванне іх у прафесійным напрамку, далучэнне да традыцыйнай і прафесійнай культуры.

*Задачы курса*:

- развіццё мастацка-вобразнага мыслення;
- атрыманне ведаў па методыцы карыстання вобразна-мастацкімі тэхнікамі і прыёмамі;
- авалоданне кампазіцыйнымі сродкамі ў формаўтварэнні;
- раскрыццё прасторавага бачання праз аналіз гісторыі мастацкай творчасці;
- фарміраванне практычных навыкаў і ўменняў, неабходных для стварэння твораў дэкаратыўнай пластыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У выніку навучання студэнт павінен *ведаць*:

- спецыфіку дэкаратыўнай пластыкі;
- сувязь і залежнасць формы ад матэрыялу;
- спецыяльныя ўласцівасці формы;
- магчымасці матэрыялу.

Студэнту неабходна *ўмець*:

- выкарыстоўваць законы кампазіцыі;
- фарміраваць ідэю вобразнага і графічнага рашэння ў макеце і матэрыяле;
- заходзіць з магчымасцяў матэрыялу;
- улічваць колер, фактуру і тэкстуры ў пластычным рашэнні;
- даводзіць стылізацыю да завяршэння.

Для курса выкарыстоўваюцца лекцыі і практычныя заняткі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць гадзін | |
|---|---|---|
| | Лекцыі | Парктычныя заняткі |
| Уводзіны | | |
| Раздзел 1<br>Сучасная разнастайнасць відаў дэкаратыўнай пластыкі і сферы яе прымяненьня. | 4 | |
| Тэма 1. Гістарычны аспект развіцця дэкаратыўнай пластыкі. | | 4 |
| Тэма 2. Стварэнне копій прыгожых формаў і вывучэнне спецыфікі іх стварэння. | | 4 |
| Тэма 3. Выразныя сродкі і матэрыялы стварэння дэкаратыўнай пластыкі. | | 6 |
| Раздзел 2<br>Кампазіцыйныя асновы і методыка стварэння дэкаратыўнай пластыкі. | | 4 |
| Тэма 4. Выкарыстанне прасторы для увасаблення аб' ектаў дэкаратыўнай пластыкі. | | 4 |
| Тэма 5. Методыка стварэння дэкаратыўнай пластыкі: ідэя, эскіз, макет, рашэнне ў натуральным памеры і матэрыяле. | | 6 |
| Тэма 6. Спецыфіка, тэхналогія і тэхніка выканання дэкаратыўнай пластыкі. | | 4 |
| Тэма 7. Тэматыка, сюжэт і мастацкі вобраз у дэкаратыўнай пластыцы. | | 4 |
| | 4 | 36 |
| **Усяго гадзін** | **40** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ПРАГРАМЫ

### Уводзіны

Асноўныя паняцці. Мэты вучэбнай дысцыпліны. Яе задачы. Прадмет і сфера вывучэння. Разнастайнасць тэматычна-вобразнага рашэння. Сувязь з кампазіцыяй і іншымі відамі мастацтваў. Сучасная блізасць да скульптуры. Стылявое, гістарычнае і аўтарскае рашэнне заданняў прадмета.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Раздзел 1. Сучасная разнастайнасць відаў дэкаратыўнай пластыкі і сферы яе прымянення.

***Тэма 1. Гістарычны аспект развіцця дэкаратыўнай пластыкі.***

Гэта ранняя форма мастацтва. Асаблівасці пластычна-вобразнага рашэння. Эстэтыка, як галоўная функцыя дэкаратыўнай пластыкі. Узровень стылізацыі. Напаўненне асяроддзя мастацкім зместам. Задачы адпаведнасці інтэр'ерна-прасторавых і архітэктурных элементаў. Гістарычны змест.

***Тэма 2. Стварэнне прыгожых формаў і вывучэнне спецыфікі іх выканання.***

Этапы рэалізацыі ідэі ў пластыцы. Практычныя веды па методыцы і спосабах распрацоўкі дэкаратыўнай пластыкі. Эстэтычныя прынцыпы. Маштабныя адносіны. Тэмы, сюжэты і формаўтварэнне.

*Тэма 3. Выразныя сродкі і матэрыялы у стварэнні дэкаратыўнай пластыкі.*

Форма. Рэльеф. Святло. Маштаб.Суразмернасць. Рацыянальнасць. Эстэтычнасць.Тэхніка выканання. Матэрыял і тэхналогія вырабу.

## Раздзел 2. Кампазіцыйныя асновы і методыка стварэння дэкаратыўнай пластыкі.

*Тэма 4. Выкарыстанне прасторы для ўвасаблення аб'ектаў дэкаратыўнай пластыкі.*

Рытм. Кантраст і нюанс. Статычныя і дынамічныя геаметрычныя асновы. Кантраст і рух. Паветрана-прасторавыя насычэнні. Прапорцыі. Універсальныя геаметрычныя формы дзеля вызначэння прасторавых абмежаванняў, у якія ўпісваецца пластыка.

*Тэма 5. Методыка стварэння дэкаратыўнай пластыкі.*

Ідэя. Эскіз. Макет. Рашэнне ў натуральным памеры і матэрыяле. Выкарыстанне матэрыялаў і тэхнік. Выразнась і суразмернасць. Маштаб, які разлічаны на чалавека. Памер формы. Ідэя і яе рэалізацыя ў макеце. Рашэнне вобразу ў матэрыяле. Разнастайнасць колеру і фактуры, насычанасць дэталямі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Тэма 6. Спецыфіка, тэхналогія і тэхніка выканання дэкаратыўнай пластыкі.***

Стылёвае адзінства і адпаведнасць. Выяўленчы, формаўтваральны і выразны характар дэкаратыўнай пластыкі. Прыёмы і этапы стылізацыі. Абагульненне. Лепка. Фармаванне. Мантаж.

***Тэма 7. Тэматыка, сюжэт і мастацкі вобраз у дэкаратыўнай пластыцы.***

Візуалізацыя ідэі. Неабмежаванасць у аўтарскім выбары тэмы. Гістарычныя, экалагічныя, біялагічныя, зааморфныя і антрапаморфныя сюжэты. Уласны эскіз і гістарычны арнамент. Уключэнне твора дэкаратыўнай пластыкі ў інтэр’ернае ці экстэр’ернае асяроддзе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЛІТАРАТУРА


**Асноўная літаратура**

1. Декоративная пластика Беларуси. [Альбом]. – Мн : Беларусь, 1989 г.
2. *Моран, А.* История декоративно-прикладного искусства: от древних времен до наших дней / А.Моран. – М.: Искусство, 1982. – 577 с.
3. *Высоцкая, Н. Ф.* Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі XII − XVIII стагоддзяў [Альбом] / Н.Ф. Высоцкая. − Мн : Беларусь, 1984. − 236 с.
4. *Высоцкая, Н.Ф.* Пластыка Беларусі XII- XVII стст. − Мн.: Беларусь, 1993. 232 с.
5. Беларуская кераміка: [Альбом] / Аўт. тэксту і склад. В.Г.Гаўрылаў. − Мн.: Беларусь, 1984. − 174 с.
6. Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. / пад рэд. С.В.Марцэлева [і інш.]. − Мн.: Навука і тэхніка, 1987. – Т. 1. – 304 с.; 1988. – Т. 2. – 384 с.; 1989. – Т. 3. – 448 с.; 1990. – Т. 4. – 352 с.; 1992. – Т. 5. – 256 с.; 1994. – Т. 6. – 375 с.

**Дадатковая літаратура**

1. История архитектуры Белоруссии: В. А. Чантурия – Мн. 1985 (третье издание).
2. Иконников А. В. Степанов Г. Л. Основы архитектурной композиции – М. 1971.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ